# НАРЫСЫ

УЛАДЗІМІР ЯКУТАЎ

## АЛЯКСАНДР ЧАРВЯКОЎ

### 1

Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў — камуніст ленінскага гарту, чалавек, які амаль семнаццаць гадоў стаяў на чале Беларускай Савецкай дзяржавы. Нарадзіўся ён 8 сакавіка 1892 года.

Бацька ягоны паходзіў з вёскі Дукоркі, тады Дукорскай воласці, на Ігуменшчыне. На зямлі не гаспадарыў — самастойна навучыўшыся грамаце, працаваў валасным пісарам. Чалавек ён быў надзвычай сумленны, мяккі, ды пры ўсёй мяккасці прынцыповы — таму жылося яму цяжка. Ён не ўмеў падхалімнічаць, не ўмеў браць з гаротных сялян хабар, і начальства перакідвала яго з месца на месца, з аднаго мізэрнага аклада на другі — Рыгор Станіслававіч атрымліваў 18 рублёў у месяц. А сям'я тым часам была вялікая, восем душ. Грошай хапала толькі на харчы і на кватэру. Таму падмацоўваць сямейны бюджэт вымушаны былі і дзеці, старэйшыя сыны Рыгора Чарвякова — Іван і Алесь.

Алесь прыгадваў пазней, як гэта было цяжка — уставаць ледзь развіднела, ісці разам з братам на будоўлю, дзе яны працавалі чорнарабочымі: падносілі цэглу і каменне, замешвалі раствор, выконвалі работу грузчыкаў — маладзенькія, амаль падлеткі... Да таго ж — трэба было яшчэ і вучыцца.

Да вучобы Алесь быў прагны — гэта было ад бацькі, які моцна любіў літаратуру і не мінаў вольнай хвіліны, каб пачытаць уголас, усім — сямейныя чытанні былі за правіла ў сям'і. Часта замест бацькі чытаў вечарамі Алесь.

Крыху лягчэй стала, калі Алесю прапанавалі пайсці працаваць пісарам — почырк у хлопца быў выдатны. Праўда, бацька спачатку не хацеў, каб сын пайшоў на той жа хлеб, што і ён сам, але на гэтым настаяла маці, якая вельмі пакутавала ад таго, што Алеська яшчэ нядужы, амаль хлопчык, вымушаны цяжка працаваць на будоўлі.

Між іншым, пісарская служба была нядрэннай сацыяльнай школай для маладога Чарвякова, дала яму магчымасць рана ўбачыць гаротнае становішча простых людзей.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Безліч розных скаргаў і прашэнняў, адрасаваных у самыя высокія інстанцыі, перапісаў Алесь за час свае службы пісарам. Праўда, калі яны вярталіся назад, на іх амаль заўсёды стаяла адно бязлітаснае слова: «Адмовіць». А людзі ж прасілі толькі самае неабходнае, толькі тое, без чаго нельга было жыць. Як ім памагчы? Хоць бы зрабіць іх пісьменнымі. І ён марыць стаць настаўнікам. А за плячыма толькі двухкласнае вучылішча. Трэба было здаць экстэрнам экзамены ў аб'ёме настаўніцкага вучылішча, атрымаць настаўніцкі дыплом...

Дзень, калі ён атрымаў дыплом, быў сапраўдным святам у сям'і — Алесь дамогся свайго, здзейсніў і мару бацькоў — яны ўбачылі сына народным настаўнікам.

Было яму тады семнаццаць гадоў.

Шчаслівы, узрушаны, поўны самых светлых надзей, прыехаў юнак у Вільню і накіраваўся ў кіраўніцтва Віленскай навучальнай акругі, каб атрымаць прызначэнне ў якую-небудзь вясковую школу.

Па наіўнасці падаўся адразу да самога папячыцеля акругі. Але там яму растлумачылі, што папячыцель не займаецца гэткімі дробязнымі справамі— ён персона важная і ўладкоўваць нейкага там новаспечанага настаўніка не мае часу — трэба вяртацца да інспектара дырэкцыі народных вучылішчаў.

Інспектар нават і ўвагі не звярнуў на юнака, які адчыніў дзверы ў його кабінет, — сядзеў сабе, утаропіўшыся ў нейкія паперы, свецячы сваёй лысінай. Алесь занепакоіўся: ніхто з ім, мабыць, і размаўляць не будзе...

Ён нясмела папрасіў дазволу ўвайсці. Чыноўнік неахвотна ўзняў галаву. Але ў гэты час у кабінет жандар увапхнуў нейкага юнака.

— Так што, ваша высакароддзе, даставіў вам таго самага разумніка,— не паздароўкаўшыся, выгукнуў жандар. — Палюбуйцеся!

— Лабас, — ветліва сказаў па-літоўску юнак, — добры дзень.

Інспектар зрабіўся чырвоны, злосна выйшаў з-за стала і, падышоўшы да юнака, крыкнуў:

— Хто вам даў права самавольнічаць? Парушаць закон? Прэч!

— Ікі пасімацімо, — па-ранейшаму ветліва, з лёгкай усмешкай адказаў юнак. — Да пабачэння.

Чарвякоў тым часам разгублена пазіраў то на інспектара, то на жандара: дзіўныя справы робяцца ў дырэкцыі народных вучылішчаў!.. Куды ён трапіў?..

Інспектар закрычаў на жандара:

— Гэта вы іх распусцілі! Вы! Што з таго, што вы яго да мяне прывялі цяпер? Трэба было не дапусціць у зародку!

— Сочым, ваш-скародзь!.. Прымаем меры!.. — гугнявіў жандар.

— Сочым! — здзекліва паўтарыў інспектар і раптам лыпнуў вачыма, убачыў Чарвякова: — Хто такі? Што вам трэба?

— Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў, — крыху збянтэжана сказаў юнак.— Я скончыў гарадское настаўніцкае вучылішча і... шукаю службу...

Ён падаў інспектару свой дыплом і пашпарт. Інспектар неахвотна ўзяў, перагартаў, крыва ўсміхнуўся.

— Так, так... Беларус... А чаму вы беларус? — інспектар утаропіў на маладога чалавека вочы. — Чаму не велікарос?

Алесь яшчэ больш збянтэжыўся, паціснуў плячыма.

— Ну, добра, пане Чарвякоў, — працадзіў праз зубы інспектар. — Пачакайце ў калідоры. Мне трэба спачатку з літоўцам пакончыць, а потым ужо беларусам займацца...

...Чарвякову пашанцавала. Інспектар запрасіў яго ў кабінет і загаварыў больш ветліва. Ён сказаў, што ў Трокскім павеце ёсць цяпер вакансія ў адным з прыходскіх вучылішчаў.

— Паедзеце туды, у Сумеліжскую воласць. Але дазвольце пацікавіц-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ца, малады чалавек: што вас паклікала на ніву народнай асветы — прызванне ці меркантыльны інтарэс?

— Люблю дзяцей, — проста адказаў Чарвякоў. — Хачу, каб яны раслі разумныя. Невуцтва — жахлівая рэч!..

— Пахвальна, малады чалавек, пахвальна, — усміхнуўся інспектар. — Служыць асветніцтву Расіі, — ён націснуў на слова «Расіі», — справа высакародная. Прашу ўлічыць... — ён памарудзіў. — Прашу ўлічыць, што вам прыйдзецца мець справу з дзецьмі... э-э... інародцаў. Літоўцаў, палякаў... э-э-э... Спадзяюся, што вы здолееце выхоўваць іх як належыць. Што вы будзеце прывіваць ім любоў і павагу да праваслаўя, да законаў расійскай імперыі, да цара!

Вочы ў інспектара заблішчалі, як гузікі на мундзіры.

...Трокі — па-літоўску Трокай — адразу прывабілі Алеся цудоўнымі краявідамі. Люстраныя азёры, магутныя старажытныя дубы, ліпы, ясені, клёны, таполі, каштаны, бэз і акацыя. Не павятовае мястэчка, а чароўны востраў!

Але жыццё простых людзей у Троках і ў наваколлі было, як і ўсюды, далёка не ідылічнае. За кароткі час малады настаўнік пабываў ледзь не ва ўсіх кутках павета і яшчэ раз пераканаўся, што лёс працоўнага люду — гэта цяжкая праца ад цямна да цямна, вечныя клопаты пра кавалак хлеба.

І яшчэ адно ўразіла і ўзрушыла Алеся: нацыянальная варожасць. У павеце жылі літоўцы, рускія, палякі, беларусы, татары, яўрэі. У большасці яны былі галота, бясконца сварыліся між сабой, часам бывалі і жорсткія бойкі.

— Чаго яны кідаюцца адзін на аднаго? — спытаў аднойчы малады настаўнік у валаснога прыстава. — Чаму б не жыць мірна? Што ім дзяліць між сабой? Нястача?

Прыстаў усміхнуўся:

— Малады вы яшчэ, пане настаўнік!.. Пакуль яны адзін аднаму горла грызуць, дзяржаве расійскай пагрозы няма. Няхай грызуць!..

Працаваць у школе было цяжка: у адным класе вучыліся і пятнаццацігадовыя і дзесяцігадовыя хлопчыкі; вучні вечна прапускалі ўрокі: у аднаго няма абутку, другі памагае дома па гаспадарцы, трэці нянчыць маленькіх брацікаў...

Але асноўная цяжкасць была ў тым, што многія дзеці не разумелі рускай мовы, на якой размаўляў малады настаўнік. А сам ён не разумеў іх роднай мовы — літоўскай і польскай. Таму яго ад вучняў аддзяляла сцяна. Гэтая сцяна была ўзведзена Міністэрствам народнай асветы, якое прадпісвала ўсё выкладанне весці толькі на рускай мове, каб русіфікаваць «інародцаў». Алесь пакутаваў ад таго, што не разумее сваіх вучняў і што яны, не разумеючы яго, кепска засвойваюць школьную праграму. І тады ён прыйшоў да крамольнай думкі вучыць дзяцей на іх роднай мове.

Але спачатку яе трэба было вывучыць самому.

Ён пачаў хадзіць на хутары да бацькоў сваіх вучняў, услухоўваўся ў літоўскую і польскую народныя гаворкі, запамінаў словы і выразы і, акрамя таго, вучыўся ў сваіх вучняў: па яго заданні яны зрабілі няхітрыя наглядныя дапаможнікі, макеты розных рэчаў і на ўроках называлі іх па-літоўску і па-польску, а ён, у сваю чаргу, даваў рускія назвы гэтых самых рэчаў. Праз некаторы час сам настаўнік, дзякуючы такой сістэме, авалодаў пэўным запасам слоў і мог сёе-тое сказаць і на літоўскай, і на польскай мовах, вучні ж, у сваю чаргу, пачалі лепш разумець рускую мову.

Былі і смешныя здарэнні, калі Алесь ужываў тое ці іншае слова не ў тым значэнні і ўвесь клас аж клаўся з рогату. Настаўнік не злаваўся, наадварот — рагатаў разам з вучнямі, а потым сур'ёзна тлумачыў:

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

— Смешна, зразумела! Але ж я з вас не смяюся, калі вы блага размаўляеце па-руску. Давайце лепш будзем папраўляць — я вас, а вы мяне.

— Герай! Добжэ! Добра! Хорошо!—на ўсіх мовах згаджалася дзятва, і Алесю хораша рабілася на сэрцы ад таго, што яму ўдаецца трымаць сардэчны кантакт з вучнямі. Такое ўзаемаразуменне ўстанавілася і з бацькамі. Маладога настаўніка сустракалі на хутарах з павагаю, да яго парад прыслухоўваліся, з ім раіліся, прызналі за аўтарытэт, хоць гэты «аўтарытэт» быў зусім яшчэ маладзён і любіў не толькі сур'ёзную гаворку, але і танцы на вячорках, спевы, юнацкія жарты.

На адной з такіх вячорак настаўнік сустрэўся з тым самым хлопцам, якога некалі жандар прыводзіў у кабінет да інспектара. Звалі гэтага хлопца Пранас Лаўрынчукас. Алесь даведаўся, што інспектар распякаў тады яго за тое, што Пранас выкладаў у «тайнай» школе, вучыў дзяцей па-літоўску. Згодна са сцверджаннем Міністэрства асветы, літоўскай мовы няма. А калі ёю дзе і карыстаюцца настаўнікі-літоўцы, дык за імі сочаць жандары.

Вось як! Выходзіць, ён, Чарвякоў, адкрыта парушае ўсе цыркуляры і распараджэнні!

— Жандары табой зацікавяцца, убачыш, — усміхаўся Пранас. — Гэта— крамола!..

І сапраўды. Неўзабаве школу наведаў валасны прыстаў.

— Раю вам, пане Чарвякоў, кінуць панібрацтва з мясцовым насельніцтвам! І папрашу вас выкладаць на расійскай мове, а не на гэтых жаргонах!

— Гэта не ваша справа, пане прыстаў! — адрэзаў Алесь. — Я настаўнік, і пакуль што я гаспадар у школе!

Так Чарвякоў трапіў у спісы ненадзейных. Чынушы з Віленскай навучальнай акругі пачалі сачыць за кожным яго крокам. Працаваць стала немагчыма, і ўвосень 1912 года яму давялося пакінуць школу ў Троках.

«Беднасць і цемната вёскі бязмежныя, — пісаў ён у той час. — Трэба аддаць усе сілы служэнню беднаму люду».

Чарвякоў у тым жа 1912 годзе паступіў у Віленскі настаўніцкі інстытут.

«У інстытуце ўпершыню стаў разбірацца ў складанасці і разнастайнасці жыцця і ў яго супярэчнасцях. У інстытуце вывучаў багаслоўныя навукі і ў той жа час асноўныя палажэнні тэорыі Дарвіна, — успамінаў пазней Чарвякоў у сваёй аўтабіяграфіі. — У інстытуце ўпершыню... пазнаёміўся з асновамі сацыялістычных ідэй».

Інстытут Чарвякоў скончыў летам 1915 года, у разгар імперыялістычнай вайны. У гэтым годзе памёр бацька, і на плечы Аляксандра ляглі амаль усе клопаты аб сям'і, якую ён карміў, аддаючы сваё невялічкае настаўніцкае жалаванне.

Настаўнічаць давялося нядоўга. Вайна прымусіла эвакуіравацца з Вільні ў Магілёў, а там, увосень 1915 года, яго «забрылі» ў салдаты.

## 2

Ваенны лёс цяпер ужо закінуў Аляксандра Чарвякова ў Тулу, дзе ён праслужыў да лютага 1916 года.

Начальства прыкмеціла адукаванага, разумнага салдата і наважыла зрабіць з яго афіцэра царскай арміі.

Праўда, такая прыхільнасць начальства да салдата тлумачылася проста: вайна патрабавала ўсё больш і больш страявых афіцэраў. Афіцэрскі корпус, доступ у які яшчэ нядаўна быў закрыты сынам бедных службоўцаў, цяпер гатовы быў начапіць залатыя пагоны на плечы выхадцаў з нізоў, абы яны падымалі ў атаку «шэрыя шынялі».

Гэтак Аляксандр Чарвякоў трапіў у Аляксандраўскае ваеннае вучы-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

лішча, адкуль у ліпені 1916 года выйшаў у чыне прапаршчыка і быў накіраваны ў Іркуцк, у запасны полк.

Малады прапаршчык з цікавасцю прыглядаўся да новага і незнаёмага для яго афіцэрскага асяроддзя. Час быў такі, што трэба было рабіць выбар — з кім ты. З тымі афіцэрамі, якія, нягледзячы на цяжкія ваенныя паражэнні царскай арміі, нягледзячы на няпэўнасць сітуацыі, на хісткасць рэжыму, на раскол грамадства, усё яшчэ верацъ у цара, б'юць салдат па зубах і рыхтуюць іх да смерці ў імя інтарэсаў «единой и неделимой»? Альбо з тымі, што махнулі на ўсё рукой, п'юць гарэлку, рэжуцца ў карты і жывуць, паўтараючы «после нас хоть потоп»? Ці з тымі, хто бачыць, што царскі ўрад давёў Расію да бездані, што трэба мяняць парадкі ў гэтай няшчаснай краіне, інакш яна паляціць ў гэтую бездань?

Малады прапаршчык зрабіў свой выбар. Ужо ў лютым 1917 года ў Петраград у кулямётную школу прыехаў не проста малады афіцэрык, які прытрымліваецца прагрэсіўных, не зусім акрэсленых поглядаў, а палітычна свядомы чалавек, за плячыма ў якога была работа агітатара, работа распаўсюджвальніка бальшавіцкіх пракламацый, чалавек, які думаў гэтак жа, як думалі бальшавікі. З імі ён зблізіўся яшчэ там, у Іркуцку.

Думаючы гэтак, як бальшавікі, прапаршчык Аляксандр Чарвякоў удзельнічаў у лютаўскай рэвалюцыі, а ў маі 1917 года наогул уступіў у рады бальшавікоў.

У гэты час ён камандаваў ротай у Другім кулямётным палку, і няблага камандаваў. Была ў Аляксандра Чарвякова ваенная жылка — ён і службу ведаў, і страляў добра. Але аўтарытэт сярод салдат заваяваў не столькі тым, што быў кемлівы, разумны і справядлівы камандзір, колькі сваім сапраўдным дэмакратызмам, уменнем размаўляць з салдатамі пра самыя складаныя рэчы проста і зразумела.

Тут, у салдацкай масе, сярод простых людзей, апранутых у шэрыя шынялі, ён зноў стаў настаўнікам, толькі выкладаў не школьныя азы, а вялікую навуку рэвалюцыі. Плён яго працы сярод салдат выявіўся ў тым, што ўся рота прапаршчыка Аляксандра Чарвякова пайшла за бальшавікамі, была патэнцыяльнай баявой адзінкай бальшавіцкага рэвалюцыйнага цэнтра Петраграда.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Гэта было вельмі важна ў тых складаных умовах, калі дэмагогія буржуазных партый Часовага ўрада, дэмагогія «сацыялістаў» тыпу Керанскага імкнулася збіць людзей з панталыку, справакаваць беспарадкі, каб «пад сурдзінку» задушыць рух нізоў. Часовы ўрад — урад «вайны да пераможнага канца» рабіў усё, каб развязаць сабе рукі, спыніць развіццё падзей у кірунку карэнных змен. Свядома перагінаючы палку, Часовы ўрад выклікаў ліпеньскія падзеі 1917 года, калі народныя масы і рэвалюцыйна настроеныя салдаты рваліся ў бой, каб ударыць па Керанскім, скінуць Часовы ўрад.

А выступаць было рана. Ворагі рэвалюцыі толькі і чакалі такога выступлення, каб заліць яго крывёю на вуліцах Петраграда, расстраляць верныя народу рэвалюцыйныя часці, раззброіць іх.

Гэта добра разумелі бальшавікі, гэта разумеў і прапаршчык Аляксандр Чарвякоў. Ён павёў сваю роту на ліпеньскае выступленне пад бальшавіцкімі лозунгамі, зрабіўшы ўсё, каб яго салдаты разабраліся ў сутнасці таго, што адбываецца; павёў таму, што не ісці было ўжо нельга — стыхія народнага гневу сама выплеснулася на вуліцы. Але рота Чарвякова ў гэтай стыхіі дзейнічала свядома, гэтак жа, як тыя калоны маніфестантаў, на чале якіх ішлі бальшавікі.

Бальшавікі ўсё зрабілі, каб ліпеньскае выступленне было мірнае, і не іх віна, што пралілася кроў — на Ліцейным праспекце, на рагу Неўскага і Садовай, каля Інжынернага замка...

Пралілася кроў, і салдаты-кулямётчыкі з новай ярасцю патрабавалі ўдарыць па Керанскім, патрабавалі, каб камандзір роты вёў іх на юнкераў. А ён цвёрда і рашуча адказваў, што дзейнічаць будзе толькі як загадае бальшавіцкі цэнтр, як загадае таварыш Ленін.

Самы адказны момант ліпеньскага выступлення рота Чарвякова сустрэла ў Петрапаўлаўскай крэпасці, несучы пільную каравульную службу, і ніхто з салдат не парушыў у той напружаны момант рэвалюцыйную дысцыпліну.

Раніцай салдаты слухалі, як Аляксандр Чарвякоў зачытваў ім загад цэнтра аб тым, каб рэвалюцыйныя воінскія часці вярнуліся ў свае казармы, і словы загаду пацвярджалі, што іх камандзір рабіў правільна, калі ўвесь час стрымліваў страсці; ён разумеў, што нельга пакуль што ісці ў лабавую атаку на верныя Керанскаму штыкі.

— Партыя бальшавікоў, таварыш Ленін, — гаварыў Чарвякоў, — просяць вас, адданых сыноў рэвалюцыі, пачакаць, набрацца цярпення. Прыйдзе час, і ўрад вайны, урад буржуазіі будзе скінуты!

Дзяржаўная Нява каціла каля муроў Петрапаўлаўскай крэпасці свае хвалі, суровым бляскам залаціліся на сонцы ствалы кулямётаў, ствалы «максімаў» рэвалюцыі. У кастрычніку 1917 года кулямётчыкі Чарвякова білі з гэтых ствалоў па Зімнім палацы.

Пасля Кастрычніка ў жыцці Аляксандра Рыгоравіча пачалася зусім новая паласа. Партыя вызваліла яго ад работы ў арміі і накіравала на работу, звязаную з будучыняй беларускага народу, з будучым лёсам былой царскай ускраіны — Беларусі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## 3

Віхура вайны адарвала ад родных мясцін мільёны людзей. Доўгія абозы няспынным патокам кіраваліся з Беларусі на ўсход, цягнікі былі перапоўнены бежанцамі. Звыш трох мільёнаў карэнных жыхароў Беларусі, Віленскай і Ковенскай губерняў сустрэлі Вялікую Кастрычніцкую рэвалюцыю ў розных кутках неабсяжнай Расіі.

Асабліва многа было бежанцаў-беларусаў у Калужскай, Маскоўскай, Пензенскай, Разанскай, Самарскай, Тамбоўскай, Уфімскай, Пскоўскай губернях, нямала было іх і ў самім Петраградзе і вакол Петраграда.

Рускія людзі стараліся памагчы бежанцам, але і сама Расія галадала, змучаная вайной, разрухай.

Каб аблягчыць становішча бежанцаў, яшчэ да Кастрычніка былі створаны шматлікія бежанскія камітэты і беларускія нацыянальныя арганізацыі, аднак на чале іх часта стаялі людзі, галоўным клопатам якіх было ажыццяўленне буржуазнай аўтаноміі Беларусі.

Нямала нацыяналістычных элементаў засела і ў Беларускай сацыялістычнай грамадзе.

Але ў Грамадзе была левая групоўка, якая супрацьстаяла нацыяналістам, выступала супроць таго, каб адарваць лёс Беларусі ад лёсу Савецкай Расіі. Лідэрам гэтай левай групоўкі стаў Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў.

Барацьба з нацыяналістамі вялася ў надзвычай складаных умовах: маладой Савецкай дзяржаве была навязана вайна з інтэрвентамі, пачынала шугаць полымя грамадзянскай вайны, а нацыяналісты, скарыстоўваючы момант, спекулявалі на абуджанай нацыянальнай самасвядомасці мас, распальвалі штучную варожасць паміж нацыямі, ставілі знак роўнасці паміж старой Расіяй і Расіяй сацыялістычнай.

Нацыяналісты стваралі розныя саюзы, рады, камітэты, якія адкрыта выступалі супроць дыктатуры пралетарыяту, супроць сацыялістычнай рэвалюцыі на Беларусі.

Так, яшчэ 27 кастрычніка 1917 года так званая Вялікая беларуская рада, Цэнтральная беларуская вайсковая рада і іншыя нацыяналістычныя арганізацыі і партыі звярнуліся да беларусаў з палітычнай дэкларацыяй, якую яны назвалі «Грамата да беларускага народу» і якая была прасякнута варожасцю да пралетарскай дыктатуры, выступала супроць пераходу ўлады ў рукі Савета Народных Камісараў. У «Грамаце» прапаведаваўся «класавы мір» паміж усімі беларусамі, беларуская нацыя разглядалася як адзіная нацыя, якая быццам бы не падзяляецца на варожыя класы. «Грамата» лічыла немагчымымі сацыялістычныя пераўтварэнні на Беларусі, уяўляла сабе беларускую дзяржаўнасць як асобную ад Савецкай Расіі і не падобную на яе — карацей кажучы, як буржуазную.

Гэты дакумент падтрымаў 17 лістапада 1917 года і Беларускі абласны камітэт пры Усерасійскім Савеце сялянскіх дэпутатаў, абнародаваўшы так званую «Дэкларацыю», сутнасць якой таксама была накіравана супроць дружбы з Савецкай Расіяй, а пра сацыялізм гаварылася адкрыта, што «мы не верым, быццам у цяперашні час... можна цалкам ажыццявіць сацыялізм».

Белабласком сам узяў на сябе права вырашыць будучы лёс Беларусі і абвясціў аб скліканні «надзвычайнага беларускага з'езду».

Праўда, у прапановах Белабласкома па скліканні з'езду было нямала красамоўных фраз, якія павінны былі маскіраваць сапраўдныя мэты яго кіраўнікоў.

Звярнуўшыся ў Народны Камісарыят па справах нацыянальнасцяў, яны прасілі згоды на скліканне «Краявога з'езду сялянскіх дэпутатаў у мэтах умацавання Савецкай улады на Беларусі» і бралі пры гэтым на сябе наступныя абавязацельствы:

«1. Дзейнічаць ва ўсім у кантакце з Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў у Мінску.

2. Краявая ўлада павінна належаць краяваму Савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў, выбраных на Краявым з'ездзе.

3. Краявы з'езд Беларусі склікаецца ад імя Беларускага абласнога камітэта і Савета дэпутатаў сумесна.

4. Тэрміновая перадача без выкупу ўсіх памешчыцкіх зямель зямельным камітэтам, якія будуць рэарганізаваны на строга дэмакратычных асновах.

5. Улада Саветам рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў на месцах.

6. Безумоўнае і поўнае права свабоднага самакіраўніцтва беларускага народу».

Наркамнац выказаў падтрымку гэтай ініцыятыве Белабласкома, што ж датычыць Чарвякова, дык ён паставіўся скептычна да ўсіх гэтых запэўненняў.

— Ад Гельмана ці Караткевіча чакаць рэвалюцыйных дзеянняў не прыходзіцца, — гаварыў ён. — Усё гэта фразы. Але паколькі з'езд адбудзецца, наша задача, задача бальшавікоў, выступіць на ім з пазіцый нашай партыі.

І ўсё ж левае крыло з'езду не змагло ў належнай ступені ўздзейнічаць на яго рашэнні. З'езд выказаўся за самавызначэнне Беларусі на буржуазнай аснове. Іншага і не магло быць — большасць дэлегатаў з рашаючым голасам прадстаўляла дробнабуржуазныя колы беларускага грамадства, валасныя і павятовыя земствы, рэакцыйных ваенных, багатых сялян і г. д. Нямала было дэлегатаў ад Беларускай народнай грамады, Цэнтральнай беларускай вайсковай рады, ад Вялікай беларускай рады.

Ды што гаварыць, нават сярод «левай» часткі з'езду прадстаўнікоў рабочых і бяднейшага сялянства можна было пералічыць на пальцах...

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Таму не дзіўна, што, калі, напрыклад, прадстаўнікі Віцебскага губеранскага з'езду Саветаў сялянскіх дэпутатаў выступілі з заклікам, накіраваным супроць аддзялення Беларусі ад Савецкай Расіі, іх ледзь не пабілі.

Аб характары краявога з'езду сведчыць і такі факт: многія дэлегаты прапанавалі адкрыць яго малебнам, наладзіць цырыманіял з тымі аксесуарамі, якія былі традыцыйнымі ў буржуазныя часы. У «савеце старэйшын» з'езду сядзелі адны лісіныя футры, генеральскія і афіцэрскія мундзіры...

Мясцовыя бальшавікі спрабавалі даць адпор антысавецкай накіраванасці з'езду, але ім, як і іншым бальшавікам, прадстаўнікам Неўскай секцыі бальшавікоў-беларусаў і петраградскіх рабочых-беларусаў, наладзілі абструкцыю. У знак пратэсту бальшавікі пакінулі з'езд.

Зыходзячы з таго, што арганізатары з'езду парушылі пагадненне з Народным Камісарыятам па справах нацыянальнасцяў, Савет Народных Камісараў Заходняй вобласці і фронту 17 снежня 1917 года распусціў з'езд і прапанаваў прэзідыуму пакінуць межы краю і фронту.

«З'езд не адлюстроўваў імкненняў рабочых і сялян Беларусі. Ён быў не патрэбны рабочым і сялянам Беларусі, — рэзюміраваў Аляксандр Чарвякоў, — бо заняў яўна варожую пазіцыю ў дачыненні да Саветаў і сацыялістычнай рэвалюцыі».

Ядро бальшавікоў-беларусаў мацнела ў Петраградзе. Толькі на Пуцілаўскім заводзе іх было каля трохсот чалавек.

Члены партыйнага камітэта Чарвякоў, Усціновіч, Лагун і іншыя вялі шырокую агітацыйна-прапагандысцкую работу, стварылі партыйную школу, саюз моладзі, розныя культурна-асветніцкія і агульнаадукацыйныя гурткі для сваіх землякоў, якіх лёсам падзей закінула з Беларусі ў Піцер.

Чарвякова ў тыя дні можна было сустрэць і ў Кранштаце, і ў трамвайным парку на Петраградскай старане, і на Артылерыйскім заводзе — усюды, дзе пралетарская маса прагна чакала слова праўды.

Зноў спатрэбілася Аляксандру Рыгоравічу яго настаўніцкая спрактыкаванасць адказваць на пытанні так, каб яго зразумеў кожны. Чарвякоў выступаў перад людзьмі не як прамоўца, а як настаўнік, гэта былі не выступленні, а шчырыя гутаркі, своеасаблівыя ўрокі, толькі слухалі Чарвякова не дзеці, а тыя, хто ўчора ўзяў уладу ў свае рукі, і цягнуліся гэтыя ўрокі без званка па чатыры гадзіны запар!..

А час быў грозны. На маладую Савецкую дзяржаву шчэрылі іклы імперыялісты і ўнутраная контррэвалюцыя, на парадак дня ставілася пытанне аб стварэнні ўзброеных сіл пралетарыяту, таму адной з галоўных тэм, якія ўзнімаў Аляксандр Чарвякоў на сваіх палітычных уроках, была размова аб неабходнасці абараняць усімі сіламі рэспубліку Саветаў. Аляксандр Рыгоравіч заклікаў сваіх землякоў улівацца ў рады Чырвонай Арміі.

Секцыя беларусаў пры Петраградскім камітэце РКП(б) па ініцыятыве Чарвякова хадайнічала перад Петраградскай ваеннай акругай наконт таго, каб сфарміраваць Беларускі воінскі полк імя таварыша Леніна.

У дакладной запісцы гаварылася:

«У адпаведнасці з прынятай пастановай аб тэрміновым фарміраванні трохмільённай Чырвонай сацыялістычнай арміі і ўлічваючы тую небяспеку, якая пагражае Савецкай Расіі як цэнтру сусветнага сацыялізму, Бюро секцыі... выказваючы волю перадавых рэвалюцыйных работнікаў беларускага пралетарыяту, звярнулася з хадайніцтвам аб выдачы мандата на фарміраванне Беларускага воінскага палка імя таварыша Леніна.

Рашэнне сфарміраваць воінскую часць з перадавых рэвалюцыйных работнікаў-беларусаў, камуністаў знайшло жывы водгук сярод астатняй часткі беларускага пралетарыяту і пачалося бесперапыннае... паступленне... людзей».

Гэта быў толькі пачатак — з добраахвотнікаў-беларусаў было сфарміра-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

вана некалькі злучэнняў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, тысячы беларусаў служылі ў раней створаных вайсковых адзінках Чырвонай Арміі, у Кранштаце быў створаны бальшавіцкі атрад з маракоў-беларусаў, шмат беларускіх камуністаў уступіла ў першы атрад асобага прызначэння пры Усерасійскай ЧК.

Ва ўсім гэтым вялікую арганізатарскую ролю адыграў Аляксандр Чарвякоў. У гэты напружаны час ён займаўся не толькі ваеннымі справамі.

Нягледзячы на небяспеку інтэрвенцыі, нягледзячы на першыя грозныя выбухі грамадзянскай вайны, Камуністычная партыя энергічна займалася наладжваннем братэрскага супрацоўніцтва нацый, прыкладала вялікія намаганні на ліквідацыю нацыянальнай варожасці паміж народамі, клапацілася аб нацыянальным адраджэнні былых ускраін старой Расіі.

Заклапочана была партыя і лёсам беларускага народу. У пачатку 1918 года пры Народным Камісарыяце па справах нацыянальнасцяў Саўнаркома Расіі быў створаны Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацком).

«Пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцяў арганізуецца Камісарыят па справах беларусаў. Камісарам па справах беларусаў назначаецца т. Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў, таварышам яго — Уладзіслаў Вікенцевіч Скарынка», — паведамлялася ў дэкрэце Савета Народных Камісараў, які быў падпісаны старшынёй СНК Ул. І. Леніным.

## 4

Брэсцкі мір... Аляксандр Рыгоравіч цалкам падзяляў пазіцыю Леніна— мір гэты трэба было падпісваць, каб заваяваць хоць кароткую перадышку маладой Савецкай дзяржаве. Падзяляў, хоць амаль уся Беларусь падпала ў выніку гэтага міру пад бот кайзераўскай Германіі.

Аднак перадышка была заваявана, і партыя з усёй энергіяй пачала мабілізоўваць сілы краіны на ўмацаванне абараназдольнасці сацыялістычнай бацькаўшчыны, разгарнула велізарную работу па ліквідацыі разбурэнняў, пачала шырокае мірнае будаўніцтва новага жыцця.

У гэтай рабоце значную ролю адыгрывалі нацыянальныя камісарыяты, задача якіх была ў тым, каб аб'яднаць усе народы на базе абароны Савецкай улады, на прынцыпах сацыялістычнай перабудовы жыцця.

Нацыянальныя камісарыяты, у прыватнасці Белнацком, глядзелі далёка наперад, разумеючы, што Брэсцкі мір рана ці позна будзе скасаваны Савецкай уладай, што прыйдзе час, калі галоўнай задачай дня стануць сацыялістычнае будаўніцтва, культура і навука. І ўжо ў той драматычны для Савецкай краіны момант сеялі камуністы зерне будучай светлай явы, думалі пра культурнае адраджэнне тых народаў, сынамі якіх яны былі.

Вось хвалюючы прыклад гэтага.

11 лютага 1918 года адбылося першае пасяджэнне калегіі Белнацкома ў складзе камісара А. Чарвякова, яго намесніка У. Скарынкі, галоўнага сакратара Зм. Жылуновіча, загадчыка бежанскага аддзела К. Дашэўскага, культурна-асветніцкага — Б. Тарашкевіча, аддзела працы — В. Лагуна.

Слухалася пытанне аб далейшым фарміраванні беларускіх падраздзяленняў для Чырвонай Арміі. У той момант гэта было самае галоўнае. Але на гэтым жа пасяджэнні абмяркоўвалася і такое: прапанова А. Чарвякова аб стварэнні і выданні беларускіх падручнікаў і прапанова Б. Тарашкевіча аб утварэнні Беларускага універсітэта.

Наконт універсітэта разгарэліся гарачыя спрэчкі: большасць удзельнікаў пасяджэння лічыла, што думаць пра гэта рана, ва ўсякім выпадку — рана вырашаць такое пытанне. Голад, холад, нястача — не да вучобы!.. Вось потым... Аднак Тарашкевіча горача падтрымаў Чарвякоў, і ў рашэннях

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

калегіі было запісана: «Даручыць культурна-асветніцкаму аддзелу распрацаваць план будаўніцтва і адкрыцця універсітэта».

На гэтым жа пасяджэнні было вырашана пачаць выданне газеты Белнацкома, якую назвалі «Дзянніца». Першы нумар яе выйшаў 1 сакавіка 1918 года, рэдактарам быў прызначаны Зм. Жылуновіч.

Работнікі Белнацкома не былі чыноўнікамі, яны мала засядалі і многа ездзілі, і часцей за ўсё ў тыя губерні, дзе жылі тысячы беларускіх бежанцаў. Не сядзеў на месцы і Чарвякоў.

Для больш мэтанакіраванай работы сярод бежанцаў былі створаны аддзяленні Белнацкома ў Петраградзе і Віцебску, потым — у Смаленску.

Петраградскае аддзяленне Белнацкома, праўда, не стваралася нанова. Пасля таго, як Белнацком перабраўся ў Маскву, Чарвякоў звярнуўся з просьбай у Народны Камісарыят па справах нацыянальнасцяў, каб пакінуць у Петраградзе частку работнікаў Белнацкома на правах аддзялення з тым, каб не спыняць работу сярод беларусаў, якія жылі ў Паўночнай вобласці.

На пост камісара па справах беларусаў у Петраградзе распараджэннем Чарвякова быў прызначаны В. Лагун.

Работа сярод бежанцаў-беларусаў набывала шырокі размах. Белнацком па прапанове Чарвякова зацвердзіў сваіх эмісараў па бежанскіх справах у Калузе, Арле, Самары, Саратаве, Тамбове, Сімбірску, Уфе, Таганрозе і ў іншых гарадах, дзе аселі многія тысячы адарваных ад роднай Беларусі людзей. Эмісары Белнацкома клапаціліся пра гэтых людзей, імкнуліся палепшыць іх матэрыяльнае становішча, а галоўнае — вялі сярод іх штодзённую палітыка-выхаваўчую работу, вырошчвалі з гэтых людзей свядомых савецкіх грамадзян.

Важную ролю адыграў Белнацком, яго аддзяленні і эмісары ў справе барацьбы з буржуазнымі нацыяналістамі. Дзякуючы дзейнасці Белнацкома, нацыяналісты былі ізаляваны ад шырокіх бежанскіх мас і не здолелі зрабіць на іх свайго шкоднага ўплыву.

Значнае месца ў дзейнасці Белнацкома займалі пытанні культурнага будаўніцтва, што было адным з галоўных клопатаў самога кіраўніка Белнацкома, былога настаўніка Аляксандра Чарвякова. Па яго прапановах Белнацкомам быў распрацаваны план культурна-асветніцкай работы сярод бежанцаў-беларусаў, у якім прадугледжвалася стварэнне народных універсітэтаў, курсаў, музычных тэатраў і г. д.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Неставала кадраў — і Аляксандр Рыгоравіч звярнуўся ў Народны Камісарыят асветы. Неўзабаве ў Маскве, у памяшканні Вышэйшых жаночых курсаў, адкрыўся Беларускі народны універсітэт, які пачаў рыхтаваць кадры беларускіх работнікаў культуры. Кантынгент слухачоў універсітэта налічваў дзвесце чалавек, а лекцыі ў ім чыталі такія вядомыя рускія вучоныя, як акадэмік Д. Анучын, прафесары Ул. Пічэта, А. Растаргуеў, Н. Халмагораў.

Белнацком арганізаваў месячны семінар настаўнікаў-беларусаў, для якіх былі прачытаны лекцыі па гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі, па яе старажытнай гісторыі, па беларускай літаратуры, выкладалася геаграфія Беларусі. Па ініцыятыве Белнацкома, асабіста Чарвякова ў Петраградзе, Маскве і ў некаторых іншых гарадах былі адкрыты беларускія школы, вялася работа па распрацоўцы беларускай граматыкі, па стварэнні падручнікаў па гісторыі і геаграфіі Беларусі, збіраліся ўзоры беларускай народнай творчасці.

Белнацком шырока разгарнуў выдавецкую дзейнасць, на беларускай мове ім былі выдадзены брашуры: «Што такое сацыялізм», «Зямельнае пытанне», «Савецкая рэспубліка», «Васьмігадзінны рабочы дзень» і іншыя.

Петраградскае аддзяленне Белнацкома выдавала часопіс «Чырвоны шлях», выпусціла ў свет мастацкі зборнік «Жніво».

Орган Белнацкома газета «Дзянніца» друкавала на сваіх старонках дэкрэты Савецкай дзяржавы, выкрывала варожую дзейнасць буржуазных нацыяналістаў, рэакцыйную сутнасць фальшывага тэзісу «беларускай незалежнасці», няўхільна праводзіла ідэю інтэрнацыянальнага адзінства ўсіх народаў, ідэю самавызначэння беларускага народу на сацыялістычнай аснове, на базе адзінай для ўсіх нацый Савецкай улады.

Першая савецкая беларуская газета «Дзянніца» адыграла вялікую ролю ў справе стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, памагаючы масам зразумець неабходнасць іменна такога, сацыялістычнага, савецкага самавызначэння беларускай нацыі.

Сорак дзевяць нумароў «Дзянніцы» — першай ластаўкі беларускага савецкага друку непарыўна звязаны з імем члена яе рэдакцыйнай калегіі Аляксандра Рыгоравіча Чарвякова.

...Ішло лета 1918 года, навальнічнае лета першага года грамадзянскай вайны, лета імклівых падзей, трывог, напружаных бяссонных начэй і ліхаманкавых дзён. Чарвякоў апынуўся нібы па-за межамі гэтай віхурнай рэчаіснасці. Хвароба!.. Гэта яна выключыла яго з ліхаманкі рэвалюцыйных будняў.

Не слухалася цела, ногі зрабіліся нібы чужыя, і без мыліц нельга ступіць і кроку. А вось розум і сэрца былі там, у гушчы падзей. Хворы прагна чакаў, калі да яго зноў прыедуць таварышы, раскажуць, што робіцца ў Белнацкоме, на радзіме.

Яны прыязджалі — Жылуновіч, Лагун, Чарнушэвіч, расказвалі. Хворы закідваў іх пытаннямі, хочучы даведацца, што робіцца там. А там рабілася вось што: 17 ліпеня па ініцыятыве Белнацкома адкрыўся Усерасійскі з'езд бежанцаў-беларусаў. На ім прысутнічала 250 дэлегатаў з Тамбоўскай, Тульскай, Саратаўскай, Цвярской і іншых губерняў, разглядаліся пытанні рээвакуацыі бежанцаў, пытанні іх матэрыяльнага становішча, пытанні палітычнай сітуацыі на Беларусі.

Праўда, эсэраўскія крыкуны прабавалі збіць дэлегатаў з панталыку, бубнілі нешта наконт таго, што, маўляў, няма ніякай беларускай буржуазіі, што беларускі народ не ведае падзелу на класы, што ўсе беларусы — працоўныя, а таму самавызначацца трэба як агульнанароднай дзяржаве і, зразумела, на аснове зусім не расійскай. Але з'езд даў рашучы адпор эсэрам, выкрыў іх буржуазную, антысавецкую, антысацыялістычную падаплёку і заявіў пра сваю безумоўную падтрымку Савецкай улады, падкрэсліў непарыўнасць гістарычнага лёсу Беларусі з лёсам Савецкай Расіі.

З'езд накіраваў прывітанне ў адрас ВЦВК. У ім, у прыватнасці, гаварылася: «Усерасійскі з'езд бежанцаў з Беларусі вітае Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і выказвае ўпэўненасць, што ён... пойдзе насустрач з'езду і паможа беларускаму народу ў вырашэнні яго надзённых патрэб і абароне яго інтарэсаў.

Са свайго боку, з'езд, які выказвае волю працоўнага беларускага народу, заўсёды будзе стаяць на варце заваёў Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і накіруе ўсе свае сілы на тое, каб адарваная гвалтам Беларусь зноў была ў адзінстве з працоўным народам Вялікай Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі».

У рэзалюцыі аб бягучым моманце з'езд даў прынцыповую ацэнку так званаму беларускаму ўраду ў Мінску, ураду, які быў створаны пад эгідай нямецкіх акупантаў.

«Гэты ўрад, — гаварылася ў рэзалюцыі, — быццам бы імкнучыся да

незалежнасці Беларусі, на самой справе... стараецца... аддаць край... германскаму імперыялізму».

Адданасць пераважнай большасці дэлегатаў з'езду справе пралетарскай рэвалюцыі, Савецкай уладзе знайшла сваё адлюстраванне ў накіраваным ад імя з'езду прывітальным пісьме Уладзіміру Ільічу Леніну, у якім гаварылася, што з'езд бежанцаў з Беларусі пастанавіў абраць Ільіча сваім ганаровым старшынёй.

Група дэлегатаў з'езду на чале з А. Усціновічам была прынята Ул. І. Леніным і перадала яму пісьмо, за якое Уладзімір Ільіч шчыра падзякаваў. Завязалася працяглая шчырая гутарка, падрабязная размова аб становішчы на Беларусі. Ільіч жыва цікавіўся гісторыяй беларускага народу, яго побытам, культурай. Ён сказаў, што Савецкая ўлада зробіць усё, каб палепшыць жыццё беларускіх працоўных мас, каб вывесці іх з цемры і адсталасці.

Лепшых навін Чарвякоў і не мог чакаць. Як толькі ён пачаў хадзіць, апіраючыся на кіёк, адразу ж пакінуў шпіталь, вярнуўся на сваё рабочае месца ў Белнацкоме і ў рэдакцыі «Дзянніцы», заняўся неадкладным пытаннем умацавання Белнацкома кадрамі выпрабаваных партыйцаў.

Справа ў тым, што ў Белнацкоме было нямала і такіх работнікаў, якія яўна хіліліся да нацыяналізму. Таму Народны Камісарыят па справах нацыянальнасцяў устанавіў у свой час кантроль над дзейнасцю Белнацкома. Аляксандр Рыгоравіч лічыў устанаўленне такога кантролю правільным, падыходзіў да гэтай акалічнасці з класавых пазіцый і цяпер, вярнуўшыся да работы, рабіў усё, каб аздаравіць і ўмацаваць апарат Белнацкома.

Быў абноўлены амаль увесь яго склад, створана фракцыя камуністаў-беларусаў, якая зрабілася кіраўнічай сілай у Белнацкоме. Па прапанове Чарвякова фракцыя ўзяла на сябе ініцыятыву стварыць у Маскве Беларускую камуністычную секцыю.

У лістападзе 1918 года быў скліканы сход камуністаў-беларусаў, які прызнаў за неабходнае «стварыць Беларускую (Маскоўскую) секцыю Расійскай Камуністычнай партыі (бальшавікоў)...».

У бюро секцыі ўвайшлі Зм. Жылуновіч, В. Лагун, А. Усціновіч. І. Хрэнаў.

Прэсненскі раённы камітэт партыі неўзабаве выдаў мандат на права існавання секцыі. У мандаце гаварылася: «Згодна з пастановай Прэсненскага камітэта РКП (бальшавікоў) ад 14 лістапада 1918 года Маскоўская беларуская секцыя РКП зацверджана».

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Газета «Дзянніца», астаючыся органам Белнацкома, зрабілася адначасова органам секцыі.

Цяпер характар работы Белнацкома змяніўся, яго дзейнасць была прасякнута духам бальшавіцкай партыйнасці, новыя кадры былі цалкам адданыя справе сацыялізму. Пра гэта сведчыць наступнае рашэнне калегіі Народнага Камісарыята па справах нацыянальнасцяў:

«У сувязі з тым, што становішча ў Беларускім Камісарыяце змянілася (стварэнне камуністычнай арганізацыі, вялікая прадукцыйнасць у рабоце), адмяніць ранейшую пастанову аб кантролі над Беларускім Камісарыятам і ўраўняць яго ў правах з іншымі камісарыятамі».

Што стаяла за гэтым выразам «вялікая прадукцыйнасць у рабоце»?

Перш за ўсё тое, што камуністы Белнацкома, члены Беларускай Камуністычнай секцыі праводзілі плённую работу сярод беларускіх бежанцаў, аб'ядноўвалі іх вакол партыі Леніна, давалі рашучы і бескампрамісны адпор нацыяналістычным элементам, вялі бежанскія масы за сабой, пад лозунгам савецкай дзяржаўнасці роднай Беларусі.

Вось толькі адзін са шматлікіх прыкладаў такой дзейнасці камуністаў, дзейнасці Аляксандра Чарвякова: 29 снежня 1918 года на мітынгу ў Маск-

ве была аднагалосна прынята рэзалюцыя аб стварэнні на Беларусі рабоча-сялянскай рэспублікі і ўстанаўленні паміж Савецкай Беларуссю і РСФСР федэратыўнай сувязі.

## 5

Аляксандр Рыгоравіч сумяшчаў сваю работу ў Белнацкоме і ў Маскоўскай беларускай секцыі РКП(б) з адказнай работай загадчыка культурна-асветніцкага аддзела Усерасійскага бюро ваенных камісараў, і менавіта ён быў першым чалавекам, які распрацаваў асновы палітработы ў Чырвонай Арміі, палітработы, якая рабіла армію першай у свеце краіны сацыялізму школай палітычнага і грамадзянскага выхавання, школай савецкага патрыятызму.

У гэты ж час Аляксандр Рыгоравіч упершыню сустрэўся з Леніным — Уладзімір Ільіч даручыў яму выступіць на чыгунцы перад эшалонамі чырвонаармейцаў-сібіракоў і ўральцаў.

— Вам прыйдзецца пайсці ў эшалоны сібіракоў і ўральцаў. Пагаварыце з імі, падбадзёрце! Думаю, вам няцяжка ўявіць, як яны цяпер выглядаюць. Пасля жорсткіх бітваў, зусім не адпачыўшы, зноў у бой. Ды яшчэ далёка ад роднага краю...

Кароткая была сустрэча, а запомнілася на ўсё жыццё, гэтак жа запомнілася, як і ўсе тыя мітынгі, сходы, на якіх выступаў Ільіч і ўдзельнікам якіх быў Аляксандр Рыгоравіч.

А больш працяглая сяброўская размова з Леніным адбылася пазней, у той час, калі ён быў Старшынёй ЦВК і СНК БССР, у студзені 1923 года.

Рэспубліка перажывала нечуваныя эканамічныя цяжкасці. Неставала самага неабходнага, замежныя краіны, як вядома, са зласлівай радасцю назіралі, як пакутуе наша краіна ў цісках эканамічнай разрухі.

Але камуністы бачылі не толькі рэальнасць моманту, але і перспектыву заўтрашняга дня. Яны стваралі апорныя пункты для ўтрымання заваёў сацыялізму.

Такімі апорнымі пунктамі, такімі плацдармамі ў вёсцы былі кааператывы. На Беларусі, у прыватнасці, было некалькі неблагіх кааператываў, але ў іх неставала цягла. Тады Чарвякоў і вырашыў звярнуцца да Леніна, прасіць у яго дапамогі.

Чарвякова прыняла Надзея Канстанцінаўна Крупская, ветліва сустрэла... Аляксандр Рыгоравіч адразу заўважыў, што яна засмучана. Было ясна, што Уладзімір Ільіч цяжка хворы...

Надзея Канстанцінаўна пачала распытваць пра справы асветы на Беларусі. Чарвякоў падрабязна расказваў і ўсё ніяк не адважваўся сказаць пра тое галоўнае, што яго прывяло сюды. Праўда, непасрэднасць і шчырасць Крупскай неўзабаве прыдалі яму адвагі, і ён нарэшце сказаў, што хацеў параіцца з Уладзімірам Ільічом наконт кааперацыі і папрасіць для Беларусі хоць бы з дзесятак трактараў.

— Добра, — згадзілася Надзея Канстанцінаўна. — Толькі спачатку я дам яму лекі...

Праз некалькі хвілін яна вярнулася, кіўнула Чарвякову:

— Заходзьце, Аляксандр Рыгоравіч. Толькі, калі ласка, пастарайцеся не вельмі хваляваць яго.

Уладзімір Ільіч ляжаў у ложку. Усміхнуўся, падаў руку:

— Рады вас бачыць... Сядайце, расказвайце. Ды не, спачатку дазвольце падзякаваць у вашай асобе ўсім беларусам за дапамогу хлебам Паволжу... Вялікае дзякуй ад мяне асабіста і ад усяго Савецкага ўрада.

Уладзімір Ільіч папрасіў Чарвякова сесці бліжэй.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

— Слухаю вас...

Чарвякоў расказваў пра становішча ў рэспубліцы, сельскай гаспадарцы, пра непаладкі з кааперацыяй.

Ленін засяроджана слухаў, і Чарвякову здавалася, што ён чымсьці незадаволены. Але як толькі Аляксандр Рыгоравіч назваў лічбу сялянскай беднаты, якая ўступае ў кааперацыю, Уладзімір Ільіч ажывіўся.

— Бліскуча! Такога масавага ўступлення сялян у арцелі яшчэ ніхто не дабіваўся...

Ён пачаў гаварыць пра тое, як важна ўмацоўваць кааператыўныя гаспадаркі, зрабіць іх узорнымі і тым самым на практыцы даказаць селяніну перавагі калектыўнай працы.

— А наогул — нам трэба наладзіць сельскагаспадарчую выстаўку. Усерасійскую. Яна паможа нам вырашыць найважнейшую задачу. Мы высвецім становішча сельскай гаспадаркі ў даны момант і зазірнём у будучыню...

Непрыкметна перайшлі на іншыя тэмы, захапіліся размовай. Надзея Канстанцінаўна ўжо некалькі разоў заходзіла ў пакой, напамінала Леніну пра забарону дактароў весці такія працяглыя дыскусіі... Нарэшце моўчкі стала ў дзвярах.

Чарвякоў спахапіўся, заспяшаўся, а Ленін звярнуўся да жонкі:

— Напішы, калі ласка, Арджанікідзе, што я прашу выдзеліць Беларусі некалькі трактараў...

Але мы крыху апярэдзілі час. Гэтая сустрэча з Ільічом была значна пазней. Пакуль што канчаўся 1918 год, і Аляксандр Чарвякоў выязджаў у Смаленск на партыйную канферэнцыю Паўночна-Заходняй вобласці. Прыехаў на месца халоднай смаленьскай ночу разам з Лагуном, Жылуновічам, Фальскім і іншымі прадстаўнікамі Беларускай секцыі РКП(б) і Белнацкома.

Смаленск!.. Недзе зусім недалёка ў заснежанай начы ляжала родная зямля, знявечаная ботамі кайзераўскіх акупантаў... Недзе там, у цемры, таіліся беларускія вёскі. Пра іх нагадвалі запрэжаныя ў санкі сялянскія коні, якія сталі каля вакзальнага будынка, — на гэтых конях прыехалі сустракаць Чарвякова і яго спадарожнікаў прадстаўнікі Паўночна-Заходняга абласнога камітэта партыі на чале з сакратаром абкома Вільгельмам Кнорыным.

— На Благавешчанскую, да гасцініцы «Англія», — сказаў Кнорын, які сеў у адны санкі з Чарвяковым, — там для вас, Аляксандр Рыгоравіч, падрыхтаваны пакой.

— Шчыра дзякую, але ў Смаленску я заседжвацца доўга не буду. Як толькі скончыцца канферэнцыя — еду ў Мінск, — адказаў Чарвякоў і, памаўчаўшы, паўтарыў ціха: — У Мінск, у Беларусь...

Санкі імчаліся хутка, хутчэй, бадай, чым цягнік, якім прыехаў Чарвякоў, і ён сказаў пра гэта Кнорыну.

— Праўда... — пагадзіўся той. — Конь пакуль што больш надзейны і спраўны транспарт. Разруха, Аляксандр Рыгоравіч.

— Разруха... Аднак паспрабуем падужаць яе...

— Абавязкова падужаем, Аляксандр Рыгоравіч!

Чарвякоў глядзеў на маўклівыя, бязлюдныя, нават без аднаго агеньчыка, вуліцы.

— Дзеля таго і збіраемся, каб падужаць... — ён павярнуўся да Кнорына. — Як з канферэнцыяй, Вільгельм Георгіевіч? Дэлегаты ўсе прыехалі?

— Гадзіну назад, перад тым, як вас сустрэць, я даведваўся: было 158 чалавек. Пакуль няма таварышаў з Магілёва, з некаторых далёкіх паветаў Віцебшчыны. Снегу — бачыце, колькі? Відаць, з гурбамі ваююць... Усяго павінна быць каля двухсот чалавек. Нават гэты гмах не ўмесціць столькі, — Кнорын паказаў на гасцініцу, да якой яны пад'ехалі.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

І сапраўды, калі сабраліся ўсе дэлегаты, месцаў у гэтай даволі шыкоўнай гасцініцы, пабудаванай у свой час для купцоў першай гільдыі і розных тайных саветнікаў, не хапіла. Некаторыя жартавалі нават, што, маўляў, і пры сваёй уладзе простага братку-беларуса не пускаюць у такія апартаменты. Спаць многім дэлегатам даводзілася проста на падлозе ў тым жа будынку, дзе праходзіла канферэнцыя, а халадэча там стаяла лютая, бо будынак той — памяшканне дарэвалюцыйнага Дваранскага сходу — не ацяпляўся.

Даймаў дэлегатаў, і ўжо не частку, а ўсіх, не толькі холад, але і голад. Елі хлеб з мякінай, успамінае дэлегат канферэнцыі В. Вашкевіч, чачавічную пахлёбку. У каго быў кавалак сапраўднага хлеба, той у перапынку паміж пасяджэннямі дзяліўся гэтым кавалкам з таварышамі.

Аднак ні холад, ні галодны паёк не маглі стрымаць баявы запал дэлегатаў. Прыўзнятасць, аптымізм панавалі ў зале. І не дзіва: большасць дэлегатаў — рабочыя, чырвонаармейцы, сяляне — былі зусім маладыя людзі, дваццацігадовыя-трыццацігадовыя камуністы.

Гэта было маладое ядро будучай Камуністычнай партыі Беларусі. Маладое, але моцнае. Яно прадстаўляла 18 тысяч камуністаў Заходняй Камуны.

На канферэнцыі было 206 дэлегатаў ад Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Смаленскай, Чарнігаўскай губерняў, а таксама прадстаўнікі ад воінскіх часцей. Гэтыя 206 чалавек слухалі гарачыя словы дакладчыка аб тым, што хвалявала ў тыя дні кожнага:

— Трэба абудзіць сілы працоўных Заходняй Камуны. Настаў час, калі і гэтая вобласць павінна сказаць, што наша шчасце ў нашых руках, што самавызначэнне працоўных залежыць ад саміх працоўных, што ў імя барацьбы з драпежнікамі капіталу сваё вызваленне мы можам атрымаць са сваіх уласных рук, а не з рук імперыялістаў у мэтах буржуазнага самавызначэння і прыгнёту. Заходняя Камуна павінна абвясціць сябе самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Беларускай Рэспублікай.

Пасля авацый у зале канферэнцыі ўсталявалася атмасфера вялікага рэвалюцыйнага свята. Гэта і было свята, якое прысутным у зале маладым людзям давялося адзначыць першымі сярод першых, свята, якое завецца сёння днём нараджэння Беларускай Савецкай дзяржавы.

І не толькі дзяржавы, але і днём нараджэння партыі беларускіх камуністаў: пасля прыняцця рэзалюцыі «Аб назве канферэнцыі» канферэнцыя стала называцца І з'ездам КПБ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Адразу ж пасля заканчэння з'езду пачалося пасяджэнне Цэнтральнага Бюро. Яно выбрала Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Беларусі, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Белнацкома, беларускіх камуністычных секцый і партыйных і савецкіх работнікаў Заходняй вобласці.

Узначаліў Часовы рабоча-сялянскі ўрад Зм. Ф. Жылуновіч.

А. Р. Чарвякоў быў зацверджаны Народным Камісарам асветы.

На сваім пасяджэнні 2 студзеня 1919 года Цэнтральнае Бюро разгледзела пытанне «Аб пераездзе ў Мінск». У адпаведнай рэзалюцыі было сказана: «...Усе члены ўрада неадкладна пераязджаюць у Мінск, газета «Звязда» пераводзіцца ў Мінск».

Дзейнасць Часовага рэвалюцыйнага ўрада Савецкай Беларусі праходзіла ў найскладанейшых гістарычных умовах: частка тэрыторыі рэспублікі ўсё яшчэ была занята нямецкімі войскамі, у вызваленых раёнах панавалі галеча і разруха, быў разладжаны транспарт, у паветах і валасцях фактычна не было мясцовых органаў Савецкай улады.

Але сацыялістычны лад на Беларусі, нягледзячы на ўсе цяжкасці і перашкоды, пускаў усё глыбейшае карэнне ў народную глебу.

2—3 лютага 1919 года ў Мінску адбыўся І з'езд Саветаў рабочых, сялян-

скіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў, якія, па сутнасці, прадстаўлялі сабою ўвесь беларускі народ. І на з'ездзе гэтым яшчэ раз была выказана рашучасць насельніцтва Беларусі звязаць свой лёс з Савецкай уладай, з сацыялізмам, з братняй савецкай Расіяй і іншымі савецкімі рэспублікамі.

З'езд абвясціў «Дэкларацыю па пытанні аб адносінах з братнімі савецкімі рэспублікамі», у якой было сказана: «Рабочыя і сяляне Беларусі ўсведамляюць, што яны з'яўляюцца адным з атрадаў вялікай пралетарскай арміі».

З прамовай на з'ездзе выступіў пасланец Ул. І. Леніна, старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Я. М. Свярдлоў. З'езд зацвердзіў дзяржаўны герб і сцяг БССР, прыняў новую Савецкую Канстытуцыю і на яе аснове абраў Цэнтральны Выканаўчы Камітэт рэспублікі — вышэйшы орган народнай улады.

3 лютага на пасяджэнні ЦК Кампартыі Беларусі было разгледжана пытанне аб Прэзідыуме ЦВК.

5 лютага адбылося першае пасяджэнне ЦВК, на якім быў зацверджаны склад Савета Народных Камісараў БССР.

Аляксандр Чарвякоў заняў у гэтым новым урадзе рэспублікі пасаду намесніка Камісара асветы.

Народная асвета — гэта яго родная ніва, яго стыхія, але ніва гэтая была далёка не сонечная, стыхія далёка не лагодная. Гэта было поле барацьбы — барацьбы са страшэннай цемрай, з невуцтвам, з галечай. Барацьбы тым больш складанай і цяжкай, бо неставала, а дзе і зусім не было ні кадраў, ні школьных памяшканняў, ні падручнікаў, ні сродкаў. І ўсё ж Чарвякоў многае зрабіў сваёй энергіяй і воляй, сваім арганізатарскім, чалавечым, настаўніцкім талентам, выклікаючы да жыцця парасткі сацыялістычнай явы ў справе народнай асветы, у справе культурнай рэвалюцыі ў Беларусі.

Аднак на даляглядзе ўжо відаць быў прывід новага імперыялістычнага нашэсця — постаць конніка ў форме белапольскага легіянера.

Неўзабаве грымнула польска-савецкая вайна, і аж да ліпеня 1920 года клубілася на Беларусі гэтая віхура. Краіны Антанты зрабілі яшчэ адну спробу адолець Савецкую ўладу, вырваць у народа яго перамогу.

Аляксандр Чарвякоў стаў у рады абаронцаў роднай зямлі ад імперыялістычнага гвалту.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## 6

Пад ударамі Чырвонай Арміі белапольскія войскі адступалі ўсё далей і далей на захад. 11 ліпеня інтэрвенты пакінулі Мінск, а ў канцы месяца наша армія ўжо вяла бай на ўскраінах Брэста, Брэст-Літоўска, як называлі яго тады.

Радасць перамогі была вялікая: прадчуваўся поўны правал намераў Антанты перамагчы Савецкую краіну сілай зброі, прадчуваўся канец вайны, няспыннай з дня абвяшчэння Савецкай улады... Але вялікі быў і боль у сэрцах пераможцаў, боль і смутак. Акупанты літаральна зруйнавалі народную гаспадарку Беларусі, знішчылі амаль усе фабрыкі і заводы, быў паралізаваны транспарт, беларуская вёска жыла ў страшэннай галечы. Падарваны былі самі асновы сельскай гаспадаркі.

У гэтых умовах ад Савецкай улады патрабаваліся сапраўды тытанічныя намаганні, каб неяк наладзіць жыццё, накарміць галодных, даць хоць нейкі заробак беспрацоўным...

Органам, якія ўзяўся за бяспрыкладна цяжкую справу адраджэння жыц-

цыя, быў Мінскі губеранскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт на чале з Аляксандрам Чарвяковым.

Камітэт гэты быў створаны Рэвалюцыйным Ваенным Саветам Заходняга фронту згодна з Палажэннем ВЦВК і Савета рабоча-сялянскай абароны ад 24 кастрычніка 1919 года, Палажэннем, якое было падпісана Ул. І. Леніным і М. І. Калініным і якое давала ваенна-рэвалюцыйным камітэтам усе неабходныя паўнамоцтвы, усю паўнату ўлады.

Першы свой загад Мінскі губрэўком выдаў у той жа дзень, калі ад белапалякаў быў вызвалены Мінск, — 11 ліпеня 1920 года.

«Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія ачысціла горад Мінск ад польскай шляхты і яе абаронцаў — белагвардзейскіх банд, — гаварылася ў загадзе.— На ўсёй вызваленай з-пад прыгнёту банд тэрыторыі Мінскай губерні з гэтага дня ўстанаўліваецца ўлада рабочых і сялян — улада Саветаў. На падставе пастановы Рэвалюцыйнага Ваеннага Савета Заходняга фронту вышэйшая грамадзянская і ваенная ўлада ў губерні да склікання з'езду Саветаў рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў перадаецца Мінскаму губеранскаму ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту».

Рэўком заклікаў грамадзян захоўваць рэвалюцыйны парадак, разгортваць у горадзе і губерні гандаль, прыкласці намаганні да таго, каб забяспечыць нармальную работу ўцалелых прадпрыемстваў, работу ўстаноў.

Працоўны народ горача адазваўся на мерапрыемствы роднай улады — у гасцініцу «Парыж», дзе размясціўся рэўком, бясконцым патокам ішлі дэлегацыі рабочых і служачых, жыхары горада, каб выказаць сваю падтрымку рэўкому, сваю гатоўнасць неадкладна ўключыцца ў работу па наладжванні нармальнага жыцця. Кожны працоўны чалавек хацеў заняць сваё месца ў страі.

— Трэба накіраваць гэтую энергію і рэвалюцыйны запал на стабілізацыю эканомікі і ўмацаванне асноў савецкага правапарадку, — гаварыў Чарвякоў у тыя дні. — Хоць і вельмі цяжка, але законны парадак мы павінны ўстанавіць.

Устанавіць законны парадак, усталяваць жыццё, увесці яго ў нармальную каляіну, забяспечыць магчымасць мірнай стваральнай працы было нялёгка.

Контррэвалюцыйныя элементы імкнуліся сарваць правядзенне Савецкай уладай палітычных і эканамічных рэформаў, у сельскай мясцовасці гойсалі раз'юшаныя банды, якія забівалі ўсіх, хто быў з камуністамі. Тэрор бандытаў падмацоўваўся актамі сабатажу — кулакі, заводчыкі, усе, хто меў раней эксплуатататарскія прывілеі, наўмысна стваралі хаос у народнай гаспадарцы, сеялі панічныя чуткі.

Чарвякоў і ўсе работнікі Мінскага губрэўкома адпачывалі ў гэты напружаны час па тры-чатыры гадзіны ў суткі, не больш. Дні і ночы былі запоўнены бясконцымі нарадамі, мітынгамі, сходамі. Іншы раз Чарвякову прыходзілася выступаць па дзесяць разоў на дзень!.. І ў Мінску, і ў навакольных мястэчках, і ў далёкіх вёсках.

Зразумела, справа не абмяжоўвалася аднымі выступленнямі — ішла вялікая арганізатарская работа, рыхтаваліся і накіроўваліся на партыйную работу ў нізы кадры. Рэўкомы — апорныя базы Савецкай улады — ствараліся паўсюдна. У другой палавіне 1920 года разгарнулі сваю дзейнасць рэўкомы Барысава, Бабруйска, Навагрудка, Нясвіжа, Слуцка, Слоніма, многіх іншых гарадоў і мястэчак, былі створаны валасныя рэўкомы. Усімі імі кіравалі часовыя партыйныя арганізацыйныя «тройкі», створаныя Кампартыяй Літвы і Беларусі разам з Мінскім губрэўкомам.

«Нашы партыйна-савецкія тройкі пачалі развіваць максімум ініцыятывы, — адзначаў Аляксандр Рыгоравіч. — Таварыш Мароз у Брэсце, таварыш Славінскі ў Гродне, а іншыя таварышы — у астатніх месцах... пры-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ступілі да стваральнай працы... Насельніцтва не толькі рабоча-сялянскае, але і інтэлігенцыя была цалкам на нашым баку».

Ваенрэўком, акрамя палітычнага ўмацавання Савецкай улады на месцах, займаўся і справамі эканомікі, справамі сельскай гаспадаркі, прымаў самыя рашучыя захады да ажыўлення гандлю.

11 верасня 1920 года ў Мінску ў гарадскім тэатры адбылася рабочая канферэнцыя. На ёй былі шырока прадстаўлены ўсе палітычныя плыні таго часу, якія адлюстроўвалі погляды розных груп рабочых горада. Нягледзячы на розніцу ў поглядах, канферэнцыя прайшла пад знакам адзінства мінскага пралетарыяту ў самым галоўным — у справе ўмацавання Савецкай улады, умацавання рабоча-сялянскай дзяржавы.

Асноўным дакладчыкам на канферэнцыі рабочых быў Аляксандр Рыгоравіч.

— У цяжкіх умовах вядзецца на Беларусі савецкае будаўніцтва, — гаварыў ён.—Беларусь, якая стала арэнай імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, якая перажыла цяжкія дні акупацыі, даведзена да гранічнай беднасці і разбурэння. І толькі савецкае будаўніцтва можа вывесці працоўных Беларусі з цяжкога эканамічнага становішча... Савецкі лад усталяваўся цяпер на Беларусі канчаткова... З прыходам Савецкай улады насельніцтва атрымала магчымасць перайсці да новага жыцця... Мы можам спакойна прыступіць да савецкай работы, апіраючыся на арганізаваныя сілы рабоча-сялянскай арміі.

Удзельнікі канферэнцыі аднадушна адобрылі дзейнасць Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, накіраваных на аднаўленне народнай гаспадаркі і на абарону краіны, што знайшло сваё адлюстраванне ў рэзалюцыях па дакладзе Чарвякова:

«Для таго, каб Ваенрэўком меў магчымасць ажыццявіць усе пастаўленыя задачы, накіраваныя на ўмацаванне дыктатуры пралетарыяту і бяднейшага сялянства, на ўсебаковае паляпшэнне жыцця працоўных мас, на канчатковую перамогу над усімі рэшткамі буржуазнага панавання, неабходны найшырэйшы ўдзел рабочых мас ва ўсіх органах Савецкай улады.

Улічваючы неабходнасць гэтага, канферэнцыя заклікае арганізаваны пралетарыят вылучыць са свайго асяроддзя лепшыя сілы для актыўнай работы.

Усе сілы пралетарыяту Мінска і ўсёй Беларусі ў цесным саюзе з РСФСР павінны быць накіраваны на ажыццяўленне задачы, якая ляжыць перад пралетарыятам усяго свету, — звяржэнне капіталізму і ўстанаўленне новага, камуністычнага грамадства».

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы